# ART-пацеркі

Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
фота Віктара Кавалёва

Гунефа Мацюшэнкава, адметная мастачка і педагог, выкладае ў Слуцкай дзіцячай мастацкай школе. Адзначана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва, шматлікімі айчыннымі ды міжнароднымі ўзнагародамі за поспехі сваіх вучняў. Яе акварэльныя творы шырока прадставіла сталічная выстаўка "Суб'ектыўнае ў аб'ектыўным" (галерэя "Універсітэт культуры"). Лакатічныя кампазіцыі Г. Мацюшэнкавай, напоўненыя тонкім суперажываннем стану прыроды, зачароўваюць трапяткім суладдзем і ўзаемапранікненнем колераў: дзе па-жывапіснаму сакавітых, а дзе някідка-нейтральных, як на манахромным эстэцкім эстампе. З экспрэсіі ліній, штрыхоў і фарбы, злучанай з жывой вадою, а таму непрадказальна-кап-



рызлівай, з'явіліся "Сакавік" — танюткія дрэўцы, абрысы дамкоў, ахінутыя святлынню і свежасцю; паэтызаваная сімволіка "Вербнага букета"; "Апошні прамень" — імгненне таго дзівоснага часу, калі на зялёны маналіт лістоты легла першае золата восені... Побач з акварэлямі Г. Мацюшэнкавай экспанаваліся работы сямі яе вучняў, сёння ўжо заўважных маладых мастакоў.

Пра стан і становішча сучаснага чалавека ў тэхнапрасторы мегаполіса задумалася фотамастачка Надзея Дзегцярова. Яе новы праект — нібы філасофская гульня на тэму: "Што можа выглядаць больш адзінокім за кропку на плоскасці? Хіба што сілуэт чалавека ў вялікім горадзе". Дзяўчына з сабакамі на праменадзе, падлетак у каменным лабірынце, апіваха ў падваротні, засяроджаная бабуля... У жорсткіх урбаністычных каардынатах "мабільных" перамоў, раскладу спраў і сустрэч, двароў-клетак, манатонных шэрых сцен, жалезабетонных слупоў, аднастайных лесвічных маршаў, закратаваных "еўравокнаў" чалавек мае сваю нішу і нібыта не



імкнецца вырвацца з яе геаметрыі. Ён рухаецца ў звыклым рытме, пакідаючы сярод чорна-белых кантрастаў ценю і святла свой сілуэт — як люструнак адзіноты... Выстаўка стрыт-фатаграфіі Н. Дзегцяровай "Геаметрыя адзіноты" адбылася ў галерэі "Універсітэт культуры".

Аляксандра Дзенісеня, 18-гадовая цымбалістка, пераможца многіх выканальніцкіх спаборніцтваў, навучэнка Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, прадставіць нашу краіну на міжнародным конкурсе маладых музыкантаў "Еўрабачанне-2012" ("Eurovision Young Musicians"). Беларусь дэбютавала на гэтай сур'ёзнай і прэстыжнай імпрэзе ў 2010-м. Тады наш віяланчэліст Іван Карызна выйшаў у фінал конкурсу.

***На здымках: Гунефа Мацюшэнкава "Венецыя"; работа Надзеі Дзегцяровай з выстаўкі "Геаметрыя адзіноты".***